# ТЭМАТЫЧНЫЯ ТРЭНІРОВАЧНЫЯ ПРАКТЫКАВАННІ ПА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ

## *Службовыя часціны мовы. Выклічнік*

У школьным курсе марфалогіі, як вядома, вывучаюцца тры службовыя часціны мовы (прыназоўнік, злучнік, часціца) і выклічнік. У працэсе падрыхтоўкі да алімпіяды вучням неабходна ўзнавіць веды аб тым, што часціны мовы – гэта цэнтральнае лінгвістычнае паняцце, яно мае шырокае значэнне і абазначае марфалагічную катэгорыю, якая вызначае размеркаванне слоў па лексіка-граматычных разрадах. Да адной часціны мовы адносяцца словы, якія маюць аднолькавае граматычнае значэнне, аднолькавы набор марфалагічных прымет. Неабходна, каб вучні ўзгадалі падставы размежавання лексіка-граматычных разрадаў, што дазволіць ім дакладна авалодаць тэхнікай аднясення слоў да розных, у тым ліку і службовых, часцін мовы.

Паглыбленне ведаў, уменняў і навыкаў пры вывучэнні службовых часцін мовы і выклічніка можна пабудаваць па наступным плане:

а) агульная катэгарыяльная функцыя службовай часціны мовы і выклічніка; б) марфалагічныя прыметы, уласцівыя пэўнай службовай часціне мовы і выклічніку; в) спалучальнасць пэўнай службовай часціны мовы і выклічніка з іншымі часцінамі мовы; г) тэкстаўтваральная роля службовай часціны мовы і выклічніка.

У час узнаўлення ведаў настаўнік кіруецца ў сваёй працы такімі спецыфічнымі прынцыпамі навучання, як: адзінства формы, значэння і функцыі, матываванасць і адрасаванасць лінгвістычнага матэрыялу, стымуляванне і арганізацыя выкарыстання граматычных ведаў у маўленчай прыктыцы і інш.

**1**. Спішыце сказы, раскрываючы пры неабходнасці дужкі. Укажыце, якімі часцінамі мовы з’яўляюцца выдзеленыя словы.

1.1. Адным заўсёды ганаруся, **што** я – сумленны чалавек (А. Астрэйка). 2. Праспявай мне песню маленства, **што** спявала не раз над калыскай (П. Трус). 3. Вось і на гэты раз усплыла ў памяці дзікая груша, **што** расла на невялічкай палянцы ў лесе (Р. Ігнаценка). 4. Кропелек чырвоных – **што** пацерак, куды ні глянь. Прыгожы з імі мох зялёны, нібы расквечаны дыван (П. Броўка). 5. **Што** кропелька, дык журавінка. Прыемна гэту назву чуць – нядарам лепшую дзяўчынку скрозь журавінкаю завуць (П. Броўка). 6. **Што** нясе нам вясна маладая? (Я. Колас). 7. **Што** не ў меру, тое ў шкоду (Прыказка). 8. У інстытуце ведалі, **што** малады інжынер вернецца ў свой Салігорск, на сваю любімую фабрыку (А. Кулакоўскі). 9. І здавалася ім, **што** з чужыны яны зноў плывуць да бацькоўскай свае старaны (А. Зарыцкі). 10.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

На схілах невысокіх гор, **што** засланяюць горад з поўначы, шумяць духмяныя гонкія сосны (Я. Брыль).

1.2. 1. **Ці** не казку лес складае ? (Я. Купала). 2. Пётра Ільіч, а разам з ім сын Міша вельмі любяць пасядзець адвячоркам **ці** ранічкаю над рэчкаю з вудаю (М. Гіль). 3. **Ці то** птушкі пяюць, **ці то** журчаць ручаі пад вузлаватымі карэннямі соснаў (М. Лынькоў). 4. **Ці** скажаце мне, якая зараз гадзіна? (Т. Хадкевіч). 5. **Ці** батрак я вам? Слуга? (Я. Колас). 6. **Ці** ён памыліўся, ці конічак збіўся? (Я. Колас). 7. Ходзім па лесе, **як** гаспадары, шукаем самае лепшае дрэва (І. Сяркоў). 8. **Як** часта ўспамінаеш сваіх настаўнікаў? (В. Вітка). 9. Між дзяцей дачку са школы **як** прыемна сустракаць (П. Броўка). 10. І гасне дзень у задуменні, **як** гаснуць жыцця летуценні (Я. Колас).

1.3. 1. **Наўсцяж** канавы мокрай пышны кураслеп жаўцее (У. Караткевіч). 2. Зялянінай **наўсцяж** убралася зямля (І. Навуменка). 3. Пад скарынкай лёду, тут жа каля хаты, працякала рэчка **скрозь** лясныя шаты (Я. Колас). 4. Што нам нясуць зямля і неба – вы адчуваць павінны **скрозь**, бо нельга ўдалеч ехаць слепа ці шпарыць, хлопцы, на авось (А. Грачанікаў). 5. Мы ішлі палявой дарогай, **пасля** выйшлі на ўзлесак (К. Чорны). 6. **Пасля** такой доўгай разлукі з домам Аленка адчувала сябе шчаслівай (Я. Колас). 7. **Насупраць** філармонія расчыніла вокны ў вясну (С. Грахоўскі). 8. Каб убачыць Купалле, мне давялося **насупраць** ночы сабрацца ў Барковічы (А. Ліс). 9. **Навокал** адно гніла куп'істая дрыгва ды моклі панурыя лясы (І. Мележ). 10. Як вядома, лягчэй за ўсё быць незаўважаным тады, калі **вакол** цябе народу многа (Я. Маўр).

1.4. 1. На горцы ціхай, невысокай, каля засценка недалёка, **у(бок)** дарогі, у глыб сада стаяла панская пасада (Я. Колас). 2. Метраў сто, а можа, дзвесце адышоў Міхед **у(бок)**, як гукнуў за лесам дзесьці басам поезда гудок (А. Астрэйка). 3. Неяк **у(вечары)** не вытрываў – прысеў да лямпы і стаў запісваць у блакнот верш, складзены ўдзень, пад гул малатарні (Я. Брыль). 4. Гаманіў бор сасновы **у(вечары)** і ранкі, над калыскай ліповай пела калыханкі ( Я. Купала). 5. **У(дзень)** свяціла сонца, і пустое поле засцілала смуга (М. Стральцоў). 6. Мікалаю Ігнатавічу **ў(дзень)** той не было нават калі паабедаць (М. Гроднеў). 7. Сцёпка стаяў **з(боку)** каля плота і слухаў гэты шум, як найпрыгажэйшую ў свеце музыку (А. Якімовіч). 8. Санкі былі з паклажай, фурманшчыкі ішлі кожны **з(боку)** сваіх саней (К. Чорны). 9. Была ўжо ноч, як яны ўдвух падаліся **у(глыб)** лесу (К. Чорны). 10. Мільёны вялікіх і дробненькіх рыб наверх усплываюць, ныраюць **у(глыб)** (П. Глебка).

**2**. Спішыце сказы, выдзеленыя словы падкрэсліце як члены сказа. *Да якой часціны мовы належаць выдзеленыя словы?

1. **Па-за** і **па-над** – складаныя прыназоўнікі. 2. **Пра**, **праз**, **паўз**, **скрозь**, **цераз** ужываюцца толькі з вінавальным склонам. 3. **У** з рознымі назоўнікамі і дзеясловамі служыць для выражэння прасторавых (зазірнуць у лес), аб'ектных (узяць у сяброўкі) і мэтавых (ісці ў кветкі) адносін. 4. Адносяць да простых злучнікаў **а**, **і**, **ды**. 5. **Каб** можа служыць для выражэння мэтавых, умоўных і тлумачальных сэнсавых адносін. 6. З дапамогай **ці-ці**, **то-то**, **не то-**

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**не то** паказваюць пералічэнне прадметаў, з’яў, падзей або іх папераменнае чаргаванне. 7. Пры дапамозе **так**, **але**, **ага** можна абазначыць станоўчы адказ на пытанне. 8. **Не**, **ні** – галоўны сродак адмаўлення ў беларускай мове. 9. У сказах, дзе прадмет параўнання толькі ўмоўны, трэба ўжываць **бы**, **нібы**, **быццам**. 10. Часам мерна, паважна адбівалі ў гняздзе на зялёнай Зайчыкавай страсе сваё “**клё-клё-клё**” бусел ці бусліха (І. Мележ). 11. Гэтае “**га**” гучала зусім ужо грозна (М. Зарэцкі). 12. Цяпер недзе за лесам, з хутара, чуваць пахатняму празаічна-дзярлівае **кукарэку** (Я. Брыль).

**3**. Запішыце па-беларуску.

3.1. Поехать за дровами, шутить над сыном, приехать через месяц, пройти по полям, послать за дочерью, идти через лес, сказать сквозь смех, опоздали из-за тебя, рассказать о друге, дом в два этажа, послать по адресу, женился на однокурснице, смеяться про себя, встретиться по случаю праздника, похожий на деда, ехать на мельницу, сказать во весь голос, создан по образцу, не выполнить из-за лени, выбрать по своему вкусу.

3.2. При старом режиме; при царе Горохе; белее снега; ничего нет дороже, чем (нежели) Родина; более сорока человек; лучший из всех; поссорились из-за пустяка; из-за шума ничего не слышно; из-за деревьев (за деревьями) леса не видеть; кирпич для строительства; зайдите за мной; из любви к театру; из-за слабости здоровья; по праздникам; по направлению к городу.

**4**. Запішыце прыназоўнікі, падкрэсліце лішняе слова ў групах.

1. Да, для, вакол, пры, у, праз, ад, аб, дзеля, цераз.
2. Наконт, апроч, абапал, замест, акрамя, паўз, побач, пасля, насустрач, услед.
3. На працягу, у сувязі, нягледзячы на, у адносінах да, з мэтай, у выніку, у час, з выпадку, за выключэннем, у параўнанні.
4. З-за, без, услед, паміж, з-пад, каля, сярод, апрача, супроць, паводле.
5. У, на, пад, з, да, ад, а, пры, праз, цераз.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**5**. Запішыце злучнікі, падкрэсліце лішняе слова ў групах.

1. Што, таму, як, калі, ды, хоць, затое, раз, ці, толькі.
2. А, але, ды, дык, аднак, ды і то, затое, а то, а не то, толькі.
3. Як, чым, што, бы, як бы, нібы, таму што, нібыта, быццам, як быццам.
4. Тым часам як, з таго часу як, пасля таго як, нягледзячы на тое што, чуць што, чуць толькі, перш чым, як толькі, абы толькі, пакуль.
5. Не толькі – але і, калі – то, не толькі – а і, не то – не то, калі – дык, як – так і, толькі – як, не то што – а, не то што – але, а раз – то.

**6**. Запішыце часціцы, падкрэсліце лішняе слова ў групах.

1. Але, аж, амаль, вось, ну і, не, ні, няхай, хіба, ці.
2. Вот, вось, от, ось, во, хоць, унь, вунь, гэта.
3. Няхай, хай, бы, дай, дайце, хіба, давай, ну, бадай, давайце.

4. Ды, дык, жа, ажно, няўжо, ну і, вось дык, аж, што за, як.

5. Не, ні, абы, небудзь, сьці, сь, ца, цца, бы, ся.

**7.** Запішыце разам, асобна ці праз злучок.

За(мест), таму(што), з(за), на(конт), як(толькі), з(пад), на(кшталт), так(што), з(па)(над), па(колькі), ды(і), дзе(небудзь), (аж)но, аль(бо), перш(чым), няхай(жа), (абы)хто, як(колечы), ды(й), дзе(сь), як(жа)(ж), прыйшоў(бы), амаль(што), (абы)што, усё(такі), хто(сьці), (а)ні, (такі)прыдумаў, з(паміж), па(над).

**8**. Выпішыце сказы, у якіх часціца ***не*** надае выказванню сцвярджальны сэнс.

1. Хто не знае тых ціхіх і сонечных ранкаў, калі на полі стаяць апошнія снапы, калі дацвітае грэчка і пажоўклае проса хіліцца долу? (П. Пестрак). 2. Адзін дасужы, ды не дужы (Прыказка). 3. Аксана гаварыла праўду. Я не мог не згадзіцца з ёй (Б. Сачанка). 4. На вакзале гоман не змаўкае, не гаснуць там ніколі ліхтары (П. Глебка). 5. Хіба ж не праўда, што свая сарочка бліжэй да цела (І. Мележ). 6. О, колькі мы не напісалі вершаў, сапраўдных вершаў пра сваіх сяброў! (Г. Бураўкін). 7. Ніколі не спыняйся на паўдарозе (Я. Колас). 8. Усе палешукі, у тым ліку і стараста, пісаць не ўмелі (Я. Колас). 9. Што кіпела ў грудзях, не магло не прарвацца (П. Броўка). 10. Міканор ледзь не ўвесь час заўважаў матчыну насцярожаную ўвагу, чакаў, што яна загаворыць (І. Мележ).

**9**. Запішыце нумары сказаў выдзеленыя словы ў якіх з’яўляюцца службовымі часцінамі мовы. Пазначце якімі.

1. Як ні разважала [Хадоська], усё выходзіла: **сама** лепш тут, у Юравічах, застацца (І. Мележ).

2. [Таццяна:] - Ну, а дзе **сама** [Марына Паўлаўна]? Я ўжо ладзілася ісці да яе, ды дасюль няўпраўка была… (М. Зарэцкі).

3. Прыцемак **сама** што пачаў ахінаць горад (Я. Васілёнак).

4. … кніга, што ляжала перад ім, **сама** меней мела гадоў сто (У. Дамашэвіч).

5. Узбіўся той пастух на гэтую грэблю, дый тупае **сабе**, прыслухоўваючыся (Р. Мурашка).

6. Сеем, зіраем Спелае збожжа, **Сабе**, краіне багацце множым (Я. Купала).

7. Як **гэта** [прыгарэлую кашу] можна есці?

8. Жывуць **сабе** камунары Весела, шчасліва (Я. Купала).

9. Адзін дуб у полі – **гэта** не лес (Прыказка).

10. І яшчэ было чым міла Тое поле хлапчуку, **Гэта** тым, што дзед Курыла Там яго трымаў руку (Я. Колас).

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

**10**. Вызначце (і запішыце), якімі моўна-маўленчымі (акцэнталагічнымі) асаблівасцямі адрозніваюцца беларускія і рускія прыназоўнікава-склонавыя канструкцыі.

На зіму – на зиму, на раку – на реку, па полі – по полю, на руку – на руку, па лесе – по лесу, на дзень – на день, па два трактары – по два трактора, за раку – за реку, за пояс – за пояс, за поўнач – за полночь, на смех – на смех, па моры – по морю.

**11**. Аднавіце прапушчаныя кампаненты (службовыя часціны мовы) у фразеалагізмах. Значэнне фразеалагізмаў патлумачце. Падбярыце і запішыце сінанімічныя.

Абводзіць ___ пальца; абсевак ___ полі; ___ адбаўляй; ___ [нажом] адрэзаў; вачэй ___ асушваць.

**12** Запішыце па 5 *дзеяслоўных* фразеалагізмаў з кампанентамі ***на***, ***па***, ***за***, ***у***.

**13**. Прыведзеныя адзінкі размяркуйце па слупках табліцы.

Стоп!; барані божа!; бацюхна!; марш!; калі ласка; падумаеш!; бывайце; гайда!; псік; вось табе і на!; баю-бай; дзень добры; дзякуй; брава!; прывітанне.

| Эмацыянальныя выклічнікі | Волевыяўленчыя выклічнікі | Выклічнікі моўнага этыкету |
|---|---|---|
| | | |

**14**. Аднавіце прапушчаныя кампаненты (службовыя часціны мовы) у прыказках. Сэнс прыказак патлумачце.

___ пары збан ваду носіць; ___ чалавека лес – паўхаты; абяцанка-цацанка, ___ дурню радасць; на малацэ апёкся, ___ і на ваду дзьмеш; больш я забыўся, ___ ты знаеш.

**15**. Падбярыце сінтаксічныя сінонімы ды выдзеленых адзінак у прыказках. Варыянты прыказак запішыце.

Дорага (дарагая) лыжка ***к абеду***; ***ад напасці*** не прапасці; на бога спадзявайся, ***а*** сам не давайся; свая кашуля бліжэй ***да цела***; ці пнём па галаве, ці галавой ***аб пень***.

**ДАВЕДКІ**

**1.**

1.1. Адным заўсёды ганаруся, **што** (злучнік) я – сумленны чалавек (А. Астрэйка). 2. Праспявай мне песню маленства, **што** (займеннік) спявала не раз над калыскай (П. Трус). 3. Вось і на гэты раз усплыла ў памяці дзякая груша, **што** (займеннік) расла на невялічкай палянцы ў лесе (Р. Ігнаценка). 4. Кропелек чырвоных – **што** (злучнік) пацерак, куды ні глянь. Прыгожы з імі мох зялёны, нібы расквечаны дыван (П. Броўка). 5. **Што** (злучнік) кропелька,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

дык журавінка. Прыемна гэту назву чуць – нядарам лепшую дзяўчынку скрозь журавінкаю завуць (П. Броўка). 6. **Што** (займеннік) нясе нам вясна маладая? (Я. Колас). 7. **Што** (займеннік) не ў меру, тое ў шкоду (Прыказка). 8. У інстытуце ведалі, **што** (злучнік) малады інжынер вернецца ў свой Салігорск, на сваю любімую фабрыку (А. Кулакоўскі). 9. І здавалася ім, **што** (злучнік) з чужыны яны зноў плывуць да бацькоўскай свае старaны (А. Зарыцкі). 10. На схілах невысокіх гор, **што** (займеннік) засланяюць горад з поўначы, шумяць духмяныя гонкія сосны (Я. Брыль).

1.2. 1. **Ці** (часціца) не казку лес складае ? (Я. Купала). 2. Пётра Ільіч, а разам з ім сын Міша вельмі любяць пасядзець адвячоркам **ці** (злучнік) ранічкаю над рэчкаю з вудаю (М. Гіль). 3. **Ці то** (злучнік) птушкі пяюць, **ці то** журчаць ручаі пад вузлаватымі карэннямі соснаў (М. Лынькоў). 4. **Ці** (часціца) скажаце мне, якая зараз гадзіна? (Т. Хадкевіч). 5. **Ці** (часціца) батрак я вам? Слуга? (Я. Колас). 6. **Ці** (злучнік) ён памыліўся, **ці** конічак збіўся? (Я. Колас). 7. Ходзім па лесе, **як** (злучнік) гаспадары, шукаем самае лепшае дрэва (І. Сяркоў). 8. **Як** (часціца) часта ўспамінаеш сваіх настаўнікаў? (В. Вітка). 9. Між дзяцей дачку са школы **як** (часціца) прыемна сустракаць (П. Броўка). 10. І гасне дзень у задуменні, **як** (злучнік) гаснуць жыцця летуценні (Я. Колас).

1.3. 1. **Наўсцяж** (прыназоўнік) канавы мокрай пышны кураслеп жаўцее (У. Караткевіч). 2. Зелянінай **наўсцяж** (прыслоўе) убралася зямля (І. Навуменка). 3. Пад скарынкай лёду, тут жа каля хаты, працякала рэчка **скрозь** (прыназоўнік) лясныя шаты (Я. Колас). 4. Што нам нясуць зямля і неба – вы адчуваць павінны **скрозь** (прыслоўе), бо нельга ўдалеч ехаць слепа ці шпарыць, хлопцы, на авось (А. Грачанікаў). 5. Мы ішлі палявой дарогай, **пасля** (прыслоўе) выйшлі на ўзлесак (К. Чорны). 6. **Пасля** (прыназоўнік) такой доўгай разлукі з домам Аленка адчувала сябе шчаслівай (Я. Колас). 7. **Насупраць** (прыслоўе) філармонія расчыніла вокны ў вясну (С. Грахоўскі). 8. Каб убачыць Купалле, мне давялося **насупраць** (прыназоўнік) ночы сабрацца ў Барковічы (А. Ліс). 9. **Навокал** (прыслоўе) адно гніла куп'істая дрыгва ды мокрыя панурыя лясы (І. Мележ). 10. Як вядома, лягчэй за ўсё быць незаўважаным тады, калі **вакол** (прыназоўнік) цябе народу многа (Я. Маўр).

1.4. 1. На горцы ціхай, невысокай, каля засценка недалёка, **у бок** (назоўнік з прыназоўнікам) дарогі, у глыб сада стаяла панская пасада (Я. Колас). 2. Метраў сто, а можа, дзвесце адышоў Міхед **убок** (прыслоўе), як гукнуў за лесам дзесьці басам поезда гудок (А. Астрэйка). 3. Неяк **увечары** (прыслоўе) не вытрываў – прысеў да лямпы і стаў запісваць у блакнот верш, складзены ўдзень, пад гул малатарні (Я. Брыль). 4. Гаманіў бор сасновы **ў вечары** (назоўнік з прыназоўнікам) і ранкі, над калыскай ліповай пела калыханкі ( Я. Купала). 5. **Удзень** (прыслоўе) свяціла сонца, і пустое поле засцілала смуга (М. Стральцоў). 6. Мікалаю Ігнатавічу **ў дзень** (назоўнік з прыназоўнікам) той не было нават калі паабедаць (М. Гроднеў). 7. Сцёпка стаяў **збоку** (прыслоўе) каля плота і слухаў гэты шум, як найпрыгажэйшую ў свеце музыку (А. Якімовіч). 8. Санкі былі з паклажай, фурманшчыкі ішлі кожны **з боку** (назоўнік з прыназоўнікам) сваіх саней (К. Чорны). 9. Была

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

ўжо ноч, як яны ўдвух падаліся **у глыб** (назоўнік з прыназоўнікам) лесу (К. Чорны). 10. Мільёны вялікіх і дробненькіх рыб наверх усплываюць, ныраюць **углыб** (прыслоўе) (П. Глебка).

**2**. 1. **Па-за і па-над** – складаныя прыназоўнікі. 2. **Пра, праз, паўз, скрозь, цераз** мы ўжываем толькі з вінавальным склонам. 3. **У** з рознымі назоўнікамі і дзеясловамі служыць для выражэння прасторавых (зазірнуць у лес), аб'ектных (узяць у сяброўкі) і мэтавых (ісці ў кветкі) адносін. 4. Адносяць да простых злучнікаў **а, і, ды**. 5. **Каб** можа служыць для выражэння мэтавых, умоўных і тлумачальных сэнсавых адносін. 6. З дапамогай **ці-ці, то-то, не то-не то** паказваюць пералічэнне прадметаў, з'яў, падзей або іх папераменнае чаргаванне. 7. Пры дапамозе **так, але, ага** можна абазначыць станоўчы адказ на пытанне. 8. **Не, ні** – галоўны сродак адмаўлення ў беларускай мове. 9. У сказах, дзе прадмет параўнання толькі ўмоўны, трэба ўжываць **бы, нібы, быццам**. 10. Часам мерна, паважна адбівалі ў гняздзе на зялёнай Зайчыкавай страсе сваё "**клё-клё-клё**" бусел ці бусліха (І. Мележ). 11. Гэтае "**га**" гучала зусім ужо грозна (М. Зарэцкі). 12. Цяпер недзе за лесам, з хутара, чуваць па-хатняму празаічна-дзярлівае **кукарэку** (Я. Брыль).

*Выдзеленыя словы з'яўляюцца назоўнікамі.

**3**.

3.1. Паехаць у дровы (па дровы), жартаваць з сына, прыехаць праз месяц, прайсці па палях, паслаць па дачку, ісці праз лес, сказаць праз смех, спазніліся праз цябе, расказаць пра сябра, дом на два паверхі, паслаць на адрас, ажаніўся з аднакурсніцаю, смяяцца самому сабе, сустрэцца з нагоды свята, падобны да дзеда (на дзеда), ехаць у млын, сказаць на поўны голас, створаны на ўзор, не выказаць праз ляноту, выбраць на свой густ.

3.2. За старым рэжымам; за царом Гарохам; бялейшы за снег; няма нічога даражэйшага за Радзіму; больш за сорак чалавек; лепшы за ўсіх (ад усіх); пасварыліся за глупства (праз глупства); за шумам (праз шум) нічога не чуваць; за дрэвамі лесу не бачыць; цэгла на будаўніцтва; зайдзіце па мяне; па любасці да тэатра; па слабасці здароўя; у святы; у кірунку да горада.

**4**.

1. Да, для, вакол, пры, у, праз, ад, аб, дзеля, цераз (вакол – вытворны прыназоўнік, астатнія невытворныя).

2. Наконт, апроч, абапал, замест, акрамя, паўз, побач, пасля, насустрач, услед (паўз – невытворны прыназоўнік, астатнія вытворныя).

3. На працягу, у сувязі, нягледзячы на, у адносінах да, з мэтай, у выніку, у час, з выпадку, за выключэннем, у параўнанні (нягледзячы на – аддзеяслоўны прыназоўнік, астатнія адыменныя).

4. З-за, без, услед, паміж, з-пад, каля, сярод, апрача, супроць, паводле (паміж ужываецца з 2-ма склонамі, астатнія з адным).

5. У, на, пад, з, да, ад, а, пры, праз, цераз (а – служыць для выражэння толькі часавых адносін, астатнія – розных адносін).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**5.**

1. Што, таму, як, калі, ды, хоць, затое, раз, ці, толькі (ды – невытворны злучнік, астатнія – вытворныя).

2. А, але, ды, дык, аднак, ды і то, затое, а то, а не то, толькі (ды і то – далучальны злучнік, астатнія – супастаўляльныя).

3. Як, чым, што, бы, як бы, нібы, таму што, нібыта, быццам, як быццам (таму што – прычынны злучнік, астатнія – параўнальныя).

4. Тым часам як, з таго часу як, пасля таго як, нягледзячы на тое што, чуць што, чуць толькі, перш чым, як толькі, абы толькі, пакуль (нягледзячы на тое што – уступальны злучнік, астатнія – часавыя)

5. Не толькі – але і, калі – то, не толькі – а і, не то – не то, калі – дык, як – так і, толькі – як, не то што – а, не то што – але, а раз – то (не то – не то – паўторны злучнік, астатнія – парныя).

**6.**

1. Але, аж, амаль, вось, ну і, не, ні, няхай, хіба, ці (ну і – састаўная часціца, астатнія – простыя).

2. Вот, вось, от, ось, во, хоць, унь, вунь, гэта (хоць – выдзяляльна-абмежавальная часціца, астатнія – указальныя).

3. Няхай, хай, бы, дай, дайце, хіба, давай, ну, бадай, давайце (хіба – мадальная пытальная часціца,  астатнія – мадальна-валявыя).

4. Ды, дык, жа, ажно, няўжо, ну і, вось дык, аж, што за, як (няўжо – мадальная пытальная часціца, астатнія – эмацыянальна-экспрэсіўныя).

5. Не, ні, абы, небудзь, сьці, сь, ца, цца, бы, ся ( бы – не афікс, астатнія – часціцы-афіксы).

**7.**

Разам: замест, наконт, накшталт, паколькі, ажно, альбо, дый, дзесь, хтосьці, ані.

Асобна: таму што, як толькі, так што, ды і, перш чым, няхай жа, як жа ж, прыйшоў бы, амаль што, такі прыдумаў.

Праз злучок: з-за, з-пад, з-па-над, дзе-небудзь, абы-хто, як-колечы, абы-што, усе-такі, з-паміж, па-над.

**8**.

1. Хто не знае тых ціхіх і сонечных ранкаў, калі на полі стаяць апошнія снапы, калі дацвітае грэчка і пажоўклае проса хіліцца долу? (П. Пестрак). 3. Аксана гаварыла праўду. Я не мог не згадзіцца з ёй (Б. Сачанка). 5. Хіба ж не праўда, што свая сарочка бліжэй да цела (І. Мележ). 9. Што кіпела ў грудзях, не магло не прарвацца (П. Броўка). 10. Міканор ледзь не ўвесь час заўважаў матчыну насцярожаную ўвагу, чакаў, што яна загаворыць (І. Мележ).

**9.** Адказ: 1; 3; 4; 5; 8; 9; 10. Выдзеленыя словы з’яўляюцца часціцамі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**10**. У прыведзены беларускіх прыназоўнікава-склонавых канструкцыях націск прыпадае толькі на самастойныя словы, у рускіх – толькі на прыназоўнікі.

**11**.

Абводзіць **вакол** пальца – спрытна, хітра ашукваць (абуваць у лапці, бакі забіваць, браць на арапа, браць на вудачку, браць на пушку, вадзіць за нос і інш.);

абсевак **у** полі – няварты чалавек, якім пагарджаюць; горшы за іншых (адстаўной казы барабаншчык, апошняя спіца ў коле, малая сошка, птушка невысокага палёту і інш.);

**хоць** адбаўляй – вельмі многа (адбою няма, ад пуза, хоць касой касі, без ліку, без меры і інш.);

**як** [нажом] адрэзаў – катэгарычна, як канчаткова вырашанае (сказаў, сказала) (як [сякерай] адсек);

вачэй **не** асушваць – несуцешна і часта плакаць (абліваецца слязамі, барозаю ліцца, выплакаць [усе] вочы, ліць слёзы, умывацца слязамі і інш.).

**12**.

З кампанентам ***на***: трапіць да Абрама *на* піва; аглядвацца *на* кусты; адступаць *на* задні план; даваць галаву *на* адрэз; іграць *на* нервах;

з кампанентам ***па***: даць *па* шапцы, даць *па* руках, трашчаць *па* швах, пайсці *па* крывой сцежцы, ісці *па* лініі найменшага супраціўлення;

з кампанентам ***за***: вадзіць *за* нос, абыходзіць *за* вярсту, брацца *за* галаву, выкідваць *за* вароты, брацца *за* жываты;

з кампанентам ***у***: кінуцца *ў* вочы, пускаць пыл *у* вочы, стукацца *ў* дзверы, пускаць казла *ў* агарод, падліваць масла *ў* агонь.

**13.**

| Эмацыянальныя выклічнікі | Волевыяўленчыя выклічнікі | Выклічнікі моўнага этыкету |
|---|---|---|
| Барані божа!; бацюхна!; падумаеш!; вось табе і на!; брава! | Стоп!; марш!; гайда!; псік; баю-бай | Калі ласка, бывайце, дзень добры, дзякуй, прывітанне |

**14**. *Да* пары збан ваду носіць – усё мае свой канец; як бы чалавек ні ўтойваў свае намеры або свае ўчынкі, усе нарэшце стане вядома;

*для* чалавека лес – паўхаты – лес для беларуса многа значыць не толькі як крыніца дабрабыту, але і як крыніца радасці ад яднання з прыродай;

абяцанка-цацанка, *а* дурню радасць – не трэба верыць пустым абяцанням, якія не падмацаваны канкрэтнымі справамі, а даюцца для таго, каб заспакоіць або ашукаць;

на малацэ апёкся, *дык* і на ваду дзьмеш – той, каго адзін раз напаткала няўдача, робіцца празмерна асцярожным;

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

больш я забыўся, *як* ты знаеш – гаворыцца з мэтай папярэдзіць, каб чалавек не вельмі спадзяваўся на свае веды.

**15**.

Дорага (дарагая) лыжка ***к абеду*** – дорага (дарагая) лыжка ***ў абед***;

***ад напасці*** не прапасці – ***з напасці*** не прапасці;

на бога спадзявайся, ***а*** сам не давайся – на бога спадзявайся, ***ды*** сам не давайся;

свая кашуля бліжэй ***да цела*** – свая кашуля бліжэй ***к целу***;

ці пнём па галаве, ці галавой ***аб пень*** – ці пнём па галаве, ці галавой ***па пні.***

Святлана Мароз,
Марына Ржавуцкая

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ